У гарадскі суд г. Мазыра,
вул. Саета, 2

Ісцец: гр. Целяпун Уладзімір Андрэевіч,
вул. Палеская, 54 – 44, г. Мазыр,
247760, Гомельскай вобл.

СКАРГА

Паважаны суд, мая скарга звязаная з устанаўленнем законнасці дзейнасці прадстаўнічых і распарадчых органаў г. Мазыра, гарсавета і гарвыканкама і адказных асобаў гарвыканкама: першага намесніка старшыні Пісаніка Л. Ф., упраўляючага справамі Пашынскага М. М. пад час фармавання Мазырскай гарадской выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Я, Целяпун Уладзімір Андрэевіч, быў вылучаны ў склад Мазырскай гарадской выбарчай камісіі ад Мазырскага гарадскога аддзялення Грамадзкага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" (рэг. № 17 ад 01.12.2002 г.) і ад групы грамадзян (падпісалася 40 чалавек, рэг. № 19 ад 03.12.2002 г.).

**04.12.2002 г**. адбылося фармаванне Мазырскай гарадской выбарчай камісіі.

**05.12.2002 г**. старшыня Мазырскага гарадскога аддзялення (МГА) ГА БНФ "Адраджэньне" Чаранкоў Юрый Мікалаевіч **(тэл. 307-13, Б. Юнацтва, 103-20)** звярнуўся з вуснай прапановай да адказных асобаў гарсавета (старшыні Арцёменка В. Р.) і гарвыканкама (упраўляючага справамі Пашынскага М. М.) каб растлумачылі юрыдычны сэнс адмовы і азнаёмілі з матэрыяламі фармавання камісіі. Ён не атрымаў тлумачэнняў адказу і яго не азнаёмілі з матэрыяламі.

**06.12.2002 г**., згодна арт. 34, ч.1, ч.2, арт. 40 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, я звярнуўся з пісьмовай Заявай да старшыні гарвыканкама Барысенка В. В. і старшыні гарсавета Арцёменка В. Р. азнаёміць мяне з матэрыяламі фармавання гарадской выбарчай камісіі і даць пісьмовыя ўдакладненні прычыны адмовы ў рэгістрацыі.

**28.12.2002 г**. я атрымаў адказ з гарвыканкама за подпісам першага намесніка старшыні Пісаніка Л. Ф., выканаўца Пашынскі М. М. № Т/1505 ад 27.12.2002 г.

Сам факт няўключэння мяне ў склад камісіі не аспрэчваецца.

Аднак незразумелы матыў, юрыдычна не абгрунтаваны, па якім гэтая адмова адбылася: ***"Городская организация ОО БНФ «Адраджэньне» не имеет первичных организаций, зарегистрированных в установленном порядке на территории города, в связи с чем не вправе выдвигать представителей в состав городской избирательной комиссии".***

Г. Мазыр ня мае на сваёй тэрыторыі юрыдычных адміністрацыйна-тэратарыяльных адзінак з распарадчымі і выканаўчымі органамі, дзе можна было б зарэгістраваць пярвічныя суполкі гарадскіх грамадзкіх аб'яднанняў.

Мазырскае гарадское аддзяленне само з'яўляецца першаснай суполкай рэспубліканскага грамадзкага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" і зарэгістравана Мазырскім гарвыканкамам згодна Закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях" (Рашэнне аб пастаноўцы на ўлік МГА ГА БНФ "Адраджэньне" №786 ад 24.08.2000 г. і выдадзена Пасведчанне аб рэгістрацыі арганізацыйнай структуры ГА БНФ "Адраджэньне" №00892/786).

Каб прывесці дзейнасць грамадзкай арганізацыі ў адпаведнасць заканадаўству мне ніхто ў гарвыканкаме, пракуратуры ня можа патлумачыць: **згодна якой частцы, якога артыкула, якога заканадаўчага акту, ў якім і кім *"установленном порядке на территории города"* неабходна зарэгістраваць «первичные организаций» першаснай суполкай, якой з'яўляецца МГА ГА БНФ "Адраджэньне".**

Я лічу, юрыдычна неабгрунтаваныя дзеянні адказных асобаў выканаўчай ўлады Пісаніка Л. Ф., Пашынскага М. М. маюць наўмысную форму па абмежаванні грамадзянскіх

350
25 02 03

і выбарчых правоў членаў нашай арганізацыі. Дадзеныя асобы, ведаючы, што іх дзеянні супрацьпраўныя, маюць абмежаванне часу на абскарджванне і каб не даць магчымасць МГА ГА БНФ "Адраджэньне" вылучыць сваіх членаў у склад участковых выбарчых камісіяў ( што і адбылося) асазнана іх утварылі.

Прашу Паважаны суд вызначыць законнасць менавіта дадзенага варыянту адказа адказнымі асобамі гарвыканкама.

Прашу Паважаны суд вызначыць адказнасць першага намесніка старшыні Мазырскага гарвыканкама Пісаніка Л. Ф., упраўляючага справамі гарвыканкама Пашынскага М. М. на адпаведнасць арт. 49 Выбарчага кодэкса РБ, арт. $167^3$ КоАП РБ, арт. 191 КК РБ. арт. 204 КК.РБ.

Да Скаргі дадаюцца наступныя дакумэнты:

- ксэракопія Заявы да старшыні гарсавета Арцёменка В. Р. І старшыні гарвыканкама Барысенка В. В. – 1 экз.;
- ксэракопія Адказу Мазырскага гарвыканкама №Т/1505 ад 27.12.2002 г. – 1 экз.;
- ксэракопія Рашэння аб пастаноўцы на ўлік МГА ГА БНФ "Адраджэньне" №786 ад 24.08.2000 г. – 1 экз.;
- ксэракопія Пасведчання аб рэгістрацыі арганізацыйнай структуры ГА БНФ "Адраджэньне" №00892/786 – 1 экз.

Па справам парушэння выбарчага заканадаўства судовыя выдаткі не спаганяюцца (арт. 337 ч. 3 ГПК РБ).

З павагаю

25.02.2003 г.

У. А. Целяпун